ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*
## *HISTOTY OF ARTS, ETHNOGRAPHY AND FOLKLORE*

УДК 398(476):94(470)»1941/1945»]:351.852
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-466-474

Поступила в редакцию 27.11.2018
Received 27.11.2018

**Н. А. Гулак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь*

# ДЗЕЙНАСЦЬ САВЕЦКІХ УСТАНОЎ ПА ВЫВУЧЭННІ ФАЛЬКЛОРУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941–1960 гг.)

**Аннотация**. На значительном фактическом материале показана работа советских учреждений науки и культуры в области изучения фольклора Великой Отечественной войны, отмечен вклад отдельных деятелей в формирование фондов фольклорных материалов. Выделены периоды развития экспедиционной и иных форм собирательской работы на протяжении 1941–1960 гг. В центре внимания автора – белорусские коллекции фольклора войны, хранящиеся в архивах Москвы и Петербурга, материалы послевоенных экспедиций М. Я. Гринблата, Л. Г. Барага, Л. С. Мухаринской в некоторые области Беларуси. Прослежено становление марксистской концепции фольклора в практике собирательской работы. Осмысление ее влияния на характер собирательской работы и содержание сборников фольклора позволяет современному исследователю народного творчества объективно оценивать многие публикации и направлять вектор исследовательского поиска в сферы, которые ранее не включались в научный дискурс.

**Ключевые слова**: Великая Отечественная война, экспедиция, собирательская работа, архив, народное творчество, публикация, социалистическая культура, партизанский фольклор, фольклористика

**Для цитирования.** Гулак, Н. А. Дзейнасць савецкіх установ па вывучэнні фальклору Вялікай Айчыннай вайны (1941–1960 гг.) / Н. А. Гулак // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2019. – Т. 64, № 4. – С. 466–474. https://doi. org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-466-474

**N. A. Hulak**

*Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus*

# SCIENTIFIC ACTIVITIES OF SOVIET INSTITUTIONS IN EXPLORING FOLKLORE OF THE GREAT PATRIOTIC WAR (1941–1960)

**Abstract.** The author relies on substantial material to explore the work of Soviet academic and cultural institutions in the field of folklore studies of the Great Patriotic War. The work points out the contribution that individual scholars have made in forming folklore collections. The article identifies the periods of expeditional and other gathering activities in 1941–1960. The author's attention is focused on the collections of Belarusian wartime folklore archived in Moscow and Saint Petersburg, the materials of post-war expeditions of M. Grinblat, L. Barag, L. Mukharynskaya to some Belarus regions. The article traces the establishment of Marxist folklore conception in science and social practice. The work reflects on the influence of this conception on the specific nature of gathering activities and the content of folklore collections, and thus helps modern folk art explorers assess the materials and publications objectively and set the direction of further research as those that have not yet been included in scientific discourse.

**Keywords**: Great Patriotic War, folk art, expedition, collecting work, archive,folk art, publication, socialist culture, folklore partisans, folklore studies

**For citation**. Hulak N. A. Scientific activities of soviet institutions in exploring folklore of the Great Patriotic War (1941–1960). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2019, vol. 64, no. 4, pp. 466–474 (in Belarusian). https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2019-64-4-466–474

© Гулак Н. А., 2019

**Уводзіны.** Пытанні збірання фальклору і задачы, якія ставіліся перад фалькларыстамі ў 1941–1960 гг., у айчыннай навуцы сістэмна не асветлены, як і дзейнасць дзяржаўных устаноў, у якіх канцэнтраваліся ваенныя палявыя матэрыялы і адкуль каардынавалася дзейнасць збіральнікаў. Асобныя звесткі па гэтай тэме прадстаўлены ў працах І. В. Гутарава, М. Я. Грынблата, А. С. Фядосіка. Аднаўленне аб'ектыўнай і поўнай гісторыі беларускай навукі 1941–1960 гг. з улікам яе сацыяльнага кантэксту застаецца актуальным для сучасных даследчыкаў, паколькі, дзякуючы калектыўным намаганням савецкіх фалькларыстаў, у гэты перыяд была знойдзена і захавана значная колькасць тэкстаў і музычных запісаў фальклору Вялікай Айчыннай вайны. Зафіксаваныя падчас бытавання жывой народнай традыцыі, гэтыя калекцыі фальклорных матэрыялаў складаюць сёння наш нацыянальны навуковы здабытак і культурную каштоўнасць.

**Асноўная частка.** Беларускія фонды фальклорных матэрыялаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, як адзначаюць В. Я. Гусеў, В. Ю. Крупянская, С. І. Мінц, І. П. Беразоўскі, А. Д. Сойманаў, В. К. Сакалова, А. С. Фядосік, пачалі фарміравацца непасрэдна ў час вайны. З першых месяцаў навуковыя ўстановы Масквы і Ленінграда, а пазней і саюзных рэспублік, разгарнулі актыўную працу. Збіранне ўзораў народнай творчасці ваеннага часу падавалася як справа дзяржаўнага значэння, сродак ідэйнай зброі ў барацьбе з ворагам. Падтрымку гэтай рабоце аказвала непасрэдна Галоўнае палітычнае ўпраўленне Узброеных Сіл СССР.

Аналіз навуковых крыніц дазваляе вылучыць тры асноўныя перыяды развіцця экспедыцыйнай і іншых форм збіральніцкай дзейнасці, скіраваных на вывучэнне народнай творчасці ваеннага часу.

*1941–1945 гг.* характарызуюцца разгортваннем збіральніцкай працы ва ўмовах вайны; трактоўкай народнай творчасці як ідэйнай зброі ў барацьбе з ворагам; фарміраваннем у грамадстве ідэі важнасці збірання фальклору (звароты, праграмы); адбываюцца экспедыцыі ў вызваленыя раёны, вядзецца работа з карэспандэнтамі.

У час вайны навуковая грамадскасць савецкай краіны ўспрымае задачы збірання народнай творчасці часоў вайны як патрыятычны абавязак. У 1944 г. прафесар М. К. Азадоўскі піша, што работа фалькларыста набывае асаблівы сэнс і значэнне – улічыць і асэнсаваць тыя новыя факты народнай творчасці, якія ўзніклі пад уздзеяннем грозных і велічных дзён вайны [1, с. 3]. У трактоўках савецкіх вучоных гэтыя новыя факты народнай творчасці паслядоўна адмяжоўваюцца ад старых. Паводле іх, фальклор вайны – гэта не перажытак мінулага, не вынік культурнай адсталасці народных мас, а «сапраўдная і жывая народная творчасць». Адна з першых спроб даць тэрміналагічнае азначэнне гэтай з'яве зроблена ў зборніку 1944 г. «Само паняцце «ваенны фальклор», – піша В. Ю. Крупянская, – давялося пашырыць. Мы ўключаем у яго не толькі непасрэдную творчасць саміх чырвонаармейскіх мас, але і творы прафесійных паэтаў і пісьменнікаў, якія распаўсюдзіліся ў гэтым асяроддзі, асіміляваліся і падпалі пад значную перапрацоўку ў адпаведнасці з паняццямі і густамі гэтага асяроддзя» [1, с. 10–11]. Такая трактоўка заставалася працоўнай практычна да 1970-х гг., калі на новым тэарэтычным узроўні было зроблена канцэптуальнае асэнсаванне паняцця «фальклор Вялікай Айчыннай вайны».

У Беларусі першыя зборнікі партызанскіх песень з'явіліся ў падпольным савецкім друку ў 1943 і 1944 гг. без імя ўкладальніка [2, с. 6]. У беларускай савецкай друкаванай прадукцыі, якая выходзіла на акупаванай тэрыторыі, рэгулярна публікаваліся малыя песенныя формы (прыпеўкі). Гэты матэрыял выступаў у якасці сродку агітацыйна-прапагандысцкай работы.

З 1942 г. у Маскве работу па збіранні, сістэматызацыі і захоўванні фальклору Вялікай Айчыннай вайны распачаў Усесаюзны Дом Народнай творчасці імя Н. К. Крупскай Камітэта па справах мастацтваў пры Наркамасветы СССР[1] (далей – УДНТ). Значным цэнтрам быў таксама Дзяржаўны літаратурны музей[2] (далей – ДЛМ). У канцы 1944 г. у Інстытуце этнаграфіі Акадэміі наук СССР[3] (далей – ІЭ) быў створаны Сектар фальклору на чале з фалькларыстам і этнографам П. Р. Багатыровым. У 1945 г. у збіральніцкую працу ўключыліся спецыялісты ІЭ, а таксма Інстытута рускай літаратуры[4] (далей – ІРЛІ). Такім чынам, быў зроблены арганіза-

[1] Сёння – Федэральная дзяржаўная бюджэтная ўстанова культуры «Дзяржаўны Расійскі Дом народнай творчасці імя В. Д. Паленава» (Масква).

[2] Сёння – Дзяржаўны музей гісторыі расійскай літаратуры імя У. І. Даля (Масква).

[3] Сёння – Інстытут этналогіі і антрапалогіі імя М. М. Міклухі-Маклая Расійскай акадэміі навук (Масква).

[4] Сёння – Інстытут рускай літаратуры (Пушкінскі Дом) Расійскай акадэміі навук (Санкт-Пецярбург).

цыйны зачын збіральніцкай працы. З 1949 г. планавыя экспедыцыі ажыццяўляў Кабінет народнай музыкі ў Маскоўскай кансерваторыі[1] – навуковае падраздзяленне па вывучэнні рускага фальклору і фальклору народаў СССР.

УДНТ працаваў праз сетку рэспубліканскіх, абласных, раённых і гарадскіх Дамоў народнай творчасці. На працягу 1942–1944 гг. установа арганізавала першыя экспедыцыі, у тым ліку ў вызваленыя ад нямецкай акупацыі Мінскую і Палескую вобласці БССР [3; с. 11–12; 2, с. 6]. Праца УДНТ была скіравана на народную творчасць у самым шырокім разуменні, уключаючы самадзейную і аматарскую. УДНТ меў сувязі з калектывамі мастацкай самадзейнасці, народнымі выканаўцамі, акумуляваў не толькі ўласна рускія творы, але і ўзоры народнай творчасці іншых нацыянальных культур, на іншых мовах. Сюды перадаваліся дзённікі, сшыткі, песеннікі франтавікоў, песні, занатаваныя ўдзельнікамі франтавой і партызанскай самадзейнасці. Беларускі фальклор у архіве ўстановы сёння прадстаўлены зборам сатырычнай прозы [4, с. 191–192].

У адрозненне ад УДНТ, Фальклорны аддзел ДЛМ, Фальклорная камісія ІЭ і Сектар народнай творчасці ІРЛІ не арыентаваліся на самадзейнасць. Аб'ектам іх увагі былі ўласна ўзоры вусна-паэтычнай творчасці, якія бытавалі ў асяроддзі ўдзельнікаў ваенных дзеянняў, партызан, палонных і насельніцтва акупаваных тэрыторый. Даследчыкі запісвалі іх у шпіталях са слоў непасрэдных удзельнікаў ваенных дзеянняў.

У 1943 г. ладзяцца дзве ўсесаюзныя нарады па праблемах фальклору Вялікай Айчыннай вайны. Першая адбылася па ініцыятыве прафесара М. К. Азадоўскага ў адным з навуковых цэнтраў у галіне рускага фальклору – Іркуцкім дзяржаўным універсітэце. Улічваючы вялікае грамадска-палітычнае значэнне гэтай тэмы, УДНТ арганізавала ўсесаюзную нараду і ў Маскве[2]. На ёй ставіліся пытанні спецыфікі фальклору ваенных гадоў, яго відаў і форм, прыёмаў і метадаў збірання і вывучэння [5, с. 8]. Гэтыя прыёмы і метады з'яўляліся, па сутнасці, ідэалагічнай ці культурна-масавай работай і не заўсёды садзейнічалі навуковаму асэнсаванню з'яў народнай культуры[3].

Асабліва дзейсным сродкам прыцягнення грамадскасці да збору фальклору ў гады вайны былі падрыхтаваныя спецыялістамі заклікі-ўлёткі да байцоў і афіцэраў і інструкцыі па запісу франтавога фальклору, якія давалі прыток матэрыялаў, пераважна песенных жанраў. У 1942 г. ДЛМ выпусціў першую такую ўлётку, у маі 1945 г. аналагічная зварот-інструкцыя была падрыхтавана ІЭ. Пры садзеянні Галоўнага палітычнага ўпраўлення Узброеных Сіл СССР яе апублікавалі ў газетах вайсковых падраздзяленняў. У выніку яе пашырэння ІЭ атрымаў «хвалюючы летапіс гераічных ваенных гадоў» [5, с. 8–10].

З пачатку вайны збіральніцкая і выдавецкая праца Фальклорнага аддзела ДЛМ звязана з імёнамі даследчыц Веры Юр'еўны Крупянскай (1897–1985) і Соф'і Ісакаўны Мінц (1899–1964), якія ўнеслі вялізны ўклад у навуковае асэнсаванне савецкіх песень вайны, у тым ліку і беларускіх. Пачатковым вынікам іх руплівай працы стаў выдадзены ў 1944 г. зборнік «Фронтовой фольклор» (уклад. В. Ю. Крупянская, пад рэд. М. К. Азадоўскага) – першае навуковае выданне па гэтай тэме[4].

У кантэксце гісторыі збірання беларускага фальклору часоў Вялікай Айчыннай вайны трэба ўказаць самую значную экспедыцыю, якая дала надзвычай каштоўныя ў навуковым сэнсе вынікі [5, с. 11; 6, с. 409]. З 6 жніўня па 13 верасня 1945 г. адбылася арганізаваная вядучымі саюзнымі ўстановамі пад кіраўніцтвам прафесара П. Р. Багатырова і В. Ю. Крупянскай вялікая навуковая экспедыцыя ў Бранскую вобласць РСФСР і сумежныя тэрыторыі БССР. Былі даследаваны асноўныя цэнтры партызанскага руху на Браншчыне, Смаленшчыне і ў Беларусі, запісана каля трохсот узораў партызанскай песні, больш за 2 тыс. прыпевак, вусныя аповеды з партызанскага жыцця, анекдоты і інш. [7, с. 6]. Асаблівую цікавасць для даследчыкаў уяўляюць зафіксаваныя тады

[1] Сёння – Навуковы цэнтр народнай музыкі імя К. В. Квіткі Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага (Масква).

[2] У 1944 г. у Кіеве ў ІМФЕ АН УРСР адбылася Рэспубліканская нарада практыкаў-збіральнікаў фальклору.

[3] УДНТ належыць і ініцыятыва пасылкі на фронт (у 1942–1944 гг.) творчых брыгад народных «сказителей», якія выступалі сярод армейскіх мас.

[4] У зборнік увайшлі, апроч іншага, улётка-зварот 1942 г. і праграма па збору паэтычнай творчасці фронту.

унікальныя тэксты былічак (9 адзінак), запіс засцерагальнага абраду прыгатавання хлеба [4, с. 190], якія сведчаць пра пераасэнсаванне ў гады вайны архаічных з'яў народнай традыцыі. Сёння матэрыялы гэтай экспедыцыі захоўваюцца ў архівах Інстытута этналогіі і антрапалогіі РАН (адз. зах. 78, 78а, 78б)[1] і Дзяржаўнага музея гісторыі расійскай літаратуры (1976 адз. зах.)[2].

Наступны перыяд – *1945–1956 гг.* – характарызуецца дзейнасцю спецыяльных устаноў па фарміраванні асновы фондаў фальклорных матэрыялаў, звязаных з вайной; развіццём экспедыцыйных і іншых форм збіральніцкай работы (усесаюзныя конкурсы збіральнікаў і выканаўцаў, прыцягненне да запісу фальклору шырокіх колаў грамадства і інш.); у грамадскай практыцы народная творчасць разам з іншымі з'явамі культуры служыць сродкам культу асобы; на акадэмічным узроўні замацоўваецца кананізацыя ваеннага фальклору. Перыяд заканчваецца 1956 г. (годам, калі адбыўся XX з'езд КПСС), канцом сталінскай эпохі, паслабленнем ідэалагічнай цэнзуры.

22–26 красавіка 1945 г. у Беларусі на першай сесіі Аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР ставіцца пытанне збірання і вывучэння фальклору Вялікай Айчыннай вайны. Загадчык Сектара этнаграфіі і фальклору М. Я. Грынблат паведамляе пра пачатак аднаўлення даваеннай сеткі карэспандэнтаў-збіральнікаў фальклору. Сапраўды, у 1930-я гг., калі вялося комплекснае народазнаўчае вывучэнне некаторых рэгіёнаў Беларусі, супрацоўнікі Акадэміі навук сфарміравалі сетку карэспандэнтаў, у якую ўвайшлі не толькі збіральнікі-краязнаўцы, але і студэнты, навучэнцы. Дзякуючы экспедыцыям і рабоце сеткі карэспандэнтаў былі назапашаны вялікія навуковыя фонды. Аднак даводзіцца канстатаваць, што збіранне ўзораў народнай творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў канцы 1940-х і 1950-я гг. мела нерэгулярны характар. Найбольш актыўна экспедыцыі адбываліся ў 1945–1946 гг. Яны звязаны з імёнамі М. Я. Грынблата, Л. Р. Барага, М. С. Мяровіч і Л. С. Мухарынскай.

У 1945–1946 гг. Сектар этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР правёў дзве першыя пасля вайны фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі пад кіраўніцтвам М. Я. Грынблата. У 1945 г. навукоўцы наведалі Плешчаніцкі, Бягомльскі раёны Мінскай вобласці і суседнія раёны Маладзечанскай вобласці, у 1946 г. працавалі ў раёнах Палескай і Пінскай абласцей, дзе сабралі, як паведамляецца ў справаздачы сектара, каштоўныя матэрыялы.

У гэты ж час былі арганізаваны чатыры фальклорныя экспедыцыі студэнтаў і аспірантаў БГУ, студэнтаў Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага пад кіраўніцтвам Л. Р. Барага і М. С. Мяровіч у раёны Баранавіцкай і Гродзенскай абласцей. Усяго было запісана каля 200 партызанскіх песень і каля 500 песень-паланянак [4, с. 190]. Акрамя песень, самабытны характар маюць і эпічныя творы (анекдоты і казкі) ваеннага часу, новыя і створаныя на традыцыйнай аснове. Даследчыкамі адзначаецца вялікая навуковая каштоўнасць беларускай калекцыі Л. Барага. Сёння гэтыя матэрыялы захоўваюцца ў архіве Інстытута этналогіі і антрапалогіі РАН і ў Рукапісным аддзеле ІРЛІ. Невялікая частка знаходзіцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музее літаратуры і мастацтва (далей – БДАМЛіМ).

У 1943–1945 гг. Л. С. Мухарынская рабіла запісы фальклору Вялікай Айчыннай вайны на Міншчыне. А з 1947 г. у рэчышчы праграмы Кабінета народнай музыкі Маскоўскай кансерваторыі па запісу фальклору Паўночнай Беларусі пачалася яе сістэматычная пошукавая і збіральніцкая работа пераважна ў Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці. Кіраваў гэтай праграмай настаўнік Л. С. Мухарынскай – музыказнаўца і фалькларыст К. В. Квітка.

Для яшчэ большай актывізацыі працы УДНТ арганізоўвае Усесаюзныя конкурсы збіральнікаў, гэтаму садзейнічала пашырэнне апытальнікаў і збіральніцкіх праграм, якія мелі водгук сярод франтавікоў, партызанаў і насельніцтва. Заўважым, што першы ў Савецкім Саюзе вопыт

[1] Дмитриева, С. И. Материалы по фольклору Великой Отечественной войны, хранящиеся в архиве Института этнографии АН СССР / Русский фольклор Великой Отечественной войны / АН СССР. Ин-т русской литературы (Пушкинский дом). – М. ; Л. : Наука, 1964. – С. 409–411. Тут жа захоўваецца калекцыя з васьмі партызанскіх песень і васьмі прыпевак з Магілёўскай вобл., артыманых М. Ісакоўскім падчас яго паездкі ў Беларусь у 1944 г.

[2] Минц, С. И. Коллекции фольклора Великой Отечественной войны в Государственном литературном музее / Русский фольклор Великой Отечественной войны / АН СССР. Ин-т русской литературы (Пушкинский дом). – М. ; Л. : Наука, 1964. – С. 409–409.

арганізацыі конкурсу на лепшага збіральніка фальклору быў назапашаны ў БССР. У 1936 г. такі конкурс з мэтай прыцягнення найбольшай колькасці карэспандэнтаў і «ўзмацнення запісу савецкага фальклору» арганізавала фальклорная камісія АН БССР.

Першы Усесаюзны конкурс стваральнікаў і збіральнікаў твораў вусна-паэтычнай творчасці адбыўся па заканчэнні вайны, увосень 1945 г. Удзельнікі прадстаўлялі самабытны і разнастайны ваенны рэпертуар, які потым служыў славесным і музычным матэрыялам для савецкай эстрады і самадзейнасці. Адбіраліся найбольш адпаведныя пастаўленым задачам творы, яны падлягалі літаратурнай і ідэалагічнай рэдакцыі з удзелам пісьменнікаў.

У 1946 г. УДНТ патрабуе ад сваіх рэгіянальных арганізацый планы па збіранні і папулярызацыі фальклору. Рэспубліканскі Дом народнай творчасці Беларусі[1] (далей – РДНТБ), атрымлівае з Масквы інструкцыю як мага больш поўна і разнастайна адлюстроўваць менавіта сучасны стан вуснай народнай творчасці [8, л. 343]. РДНТБ, відавочна, не мае значнага рэсурсу, бо займае адзін пакой (№ 718) у Доме ўрада ў Мінску, з'яўляючыся, па сутнасці, упраўленнем.

У сакавіку 1946 г. УДНТ аб'яўляе новы Усесаюзны конкурс збіральнікаў фальклору, цяпер ставіцца мэта выявіць лепшыя творы сучаснай творчасці народаў СССР. Запрашаюцца ўсе рэгіянальныя ўстановы, а таксама спецыялісты і аматары. Конкурс скіраваны на адбор новых твораў савецкай вуснай народнай творчасці [8, л. 344–345].

Паколькі ў пасляваенны перыяд задачы збірання і вывучэння фальклору Вялікай Айчыннай вайны ставіліся ва ўсіх саюзных рэспубліках, узнікла неабходнасць стварыць агульную праграму даследаванняў і каардынаваць намаганні навукоўцаў. 9–14 снежня 1947 г. была склікана спецыяльная Усесаюзная нарада, якая прайшла ў ІЭ АН СССР[2]. На ёй увага была сканцэнтравана на цэнтральнай праблеме тагачаснай фалькларыстыкі – збіранні, вывучэнні і выданні народнай творчасці часоў вайны. Беларускую навуку з тэмай партызанскага фальклору прадстаўлялі І. В. Гутараў[3], Л. Г. Бараг, М. Я. Грынблат, Г. І. Цітовіч. Неафіцыйна прызнавалася, што ў БССР партызанскі фальклор[4] з'яўляецца прыярытэтным і найбольш грунтоўна даследуецца [9, с. 210–215].

Удзельнікі нарады ахарактарызавалі спецыфіку і ўмовы бытавання народнай творчасці часоў вайны, трансфармацыю песенных і празаічных жанраў. Указвалася, што пры публікацыі тэкстаў неабходна ўлічваць ідэйна-палітычны і эстэтычны крытэрый. Узнімалася пытанне аб метадзе сацыялістычнага рэалізму ў фальклоры, героіка-эпічных матывах і стварэнні гераічнага вобраза (Сталін як правадыр і натхняльнік Перамогі). Дакладчыкі з саюзных рэспублік адзначалі ўплыў на нацыянальныя культуры рускай літаратуры, рускай народнай творчасці і савецкай масавай песні.

Галоўнай ідэяй, якая прасочвалася ў дакладах і выступленнях, была трактоўка фальклору савецкага народа як з'явы якасна новай, што развіваецца і мае вялікую будучыню. Перыяд заняпаду народнай творчасці, уласцівы эпосе капіталізму, паводле выступоўцаў, ва ўмовах сацыялістычнага ладу змяняецца яе надзвычайным росквітам [9, с. 216]. Пры гэтым узнімаліся і актуальныя праблемы публікацыі фальклорнага матэрыялу, у прыватнасці, размежаванне тыпаў выданняў. Дакладнасць і паўната запісу, навуковы апарат, вычарпальны каментарый – абавязковыя ў зборніку, які прэтэндуе на навуковае значэнне[5]. У выданнях для масавага чытача на першы план выходзіць крытычны ідэйны адбор публікуемых матэрыялаў.

Такім чынам, у дзейнасці фалькларыстаў таго часу адлюстроўвалася марксісцкая канцэпцыя народнай творчасці, сфармуляваная А. М. Горкім, паводле якой, сапраўдны фальклор – гэта не

[1] Установа ўтворана ў лютым 1937 г. З 26.03.1946 г. па 18.03.1952 г. яна называлася Рэспубліканскі Дом народнай творчасці БССР Упраўлення па справах мастацтваў пры СМ БССР.

[2] Другая Усесаюзная канферэнцыя па гэтай праблематыцы адбылася ў Кіеве ў Інстытуце мастацтвазнаўства, фальклору і этнаграфіі АН УССР (1961).

[3] Іван Васільевіч Гутараў (1906–1967) – літаратуразнавец і фалькларыст, за ўдзел у партызанскай барацьбе на Бранскім фронце ўзнагароджаны ордэнамі і медалём, першы доктар па філалагічных навуках у БССР у пасляваенны час (1949), член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР (1953).

[4] Акрамя партызанскага, разглядаўся фальклор *франтавы*, фальклор *насельніцтва часова акупаваных тэрыторый* і *працоўных тылу*, «*песні няволі*» (песні паланянак).

[5] Па выніках нарады 1947 г. В. Ю. Крупянскай падрыхтаны метадычныя рэкамендацыі «Фольклор Великой Отечественной войны (задачи и методы собирания)» (1949).

рэліктавыя з'явы, а сучасная творчасць працоўнага народа. Для вызначэння сапраўдных пралетарскіх твораў трэба прымяняць ідэйны, этычны і мастацкі ацэначны крытэрый, што дазволіць выявіць і адрынуць нізкаякасныя ў ідэйных адносінах узоры, створаныя часам дэкласаванымі элементамі [10, с. 5]. Так, горкаўскія тэзісы пра народную творчасць як дзейсны фактар сацыяльнага выхавання мас фарміравалі праблемнае поле савецкай фалькларыстыкі [11, с. 229]. Метавіта гэтым тлумачыцца, чаму пераважная большасць тагачасных зборнікаў (падборак у часопісах, газетах і інш.) змяшчала ідэйна заангажаваныя, сацыяльна завостраныя творы і часта мела агітацыйна-папулярызатарскае прызначэнне.

У 1948 г. УДНТ дасылае ў РДНТБ рэкамендацыю па пытаннях працы збіральніка: «Часам можна яшчэ сустрэць стаўленне да працэсаў збору фальклору як да пасіўнай фіксацыі матэрыялу. З гэтых пазіцый фалькларыст-збіральнік робіцца прапагандыстам толькі з моманту апублікавання ім сабранага матэрыялу. Гэта няправільная пазіцыя. Несумненна, што канчатковая мэта збіральніцкай працы – апублікаванне матэрыялу, але і сам працэс збору матэрыялу можа і павінен спрыяць развіццю народнай творчасці, павышэнню ідэйнага і мастацкага ўзроўню яго прадстаўнікоў, выхаванню крытычных адносін да ствараемых і выконваемых твораў» [8, л. 257–258].

Такім чынам, у канцы 1940-х гг. экспедыцыйная праца фалькларыстаў трактуецца, па сутнасці, як асветніцка-прапагандысцкая, у выніку якой да прадстаўнікоў народнага мастацтва павінны быць данесены мэты, якія стаяць перад савецкім мастацтвам і перад усёй савецкай грамадскасцю: «Працэс адбору збіральнікамі ўзораў сучаснай народнай творчасці, якія паўнавартасна адлюстроўваюць нашу рэчаіснасць, развіваюць лепшыя традыцыі народнага мастацтва, а таксама перадавой па дэмакратычных тэндэнцыях класічнай фальклорнай спадчыны, правільна арыентуе ідэйную, палітычную мэтанакіраванасць народных спевакоў, актывізуе разуменне імі ўплыву ролі мастацтва на свядомасць людзей» [8, л. 257–258]. Адной з галоўных тэм размоў збіральнікаў з народнымі спевакамі павінна быць «усебаковае растлумачэнне актыўнай дзейснай ролі мастацтва (прафесійнага і народнага) у грамадскім жыцці краіны». Правільна зразумелы і зроблены збор фальклору – найважнейшая задача Дамоў народнай творчасці. Такая ўстаноўка падмацоўваецца чарговым рашэннем ЦК ВКП (б) па пытаннях музыкі[1], у якім адзначаецца неабходнасць цеснай узаемасувязі прафесійнага мастацтва з народным.

Ацэньваючы здабыткі беларускіх экспедыцый пасляваеннага часу, даследчыкі, з аднаго боку, прызнаюць надзвычайную каштоўнасць іх вынікаў [12, с. 23; 13, с. 21]. З другога боку, не аспрэчваецца і тое, што ў плане рэгулярнасці і маштабнасці праца па збіранні ваеннага фальклору не ахоплівала ўсіх раёнаў Беларусі, не была сістэматычнай і таму не магла выявіць найбольш таленавітых носьбітаў. Усё гэта, як піша А. С. Фядосік у манаграфіі «Беларуская савецкая фалькларыстыка» (1987), не дазваляла зрабіць вывады аб фальклорных працэсах, жанравай структуры і асаблівасцях бытавання узораў народнай творчасці [14, с. 147]. Наогул у пасляваенныя гады навуковыя даследаванні па фальклорнай праблематыцы нікім не каардынаваліся, таму кожная ўстанова сама вызначала тэматыку работ. Прывядзём яшчэ цытату з працы тагачаснага загадчыка сектара фальклору Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР А. С. Фядосіка: «Фалькларыстычная дзейнасць была ў пэўнай ступені стыхійнай, музыказнаўцы-фалькларысты займаліся збіраннем, апрацоўкай і выданнем народна-песеннай творчасці, зыходзячы з практычных праблем развіцця музычнага мастацтва, фалькларысты-славеснікі імкнуліся выдаць зборнікі фальклорных твораў без музычнай часткі» [14, с. 151].

У пачатку 1950-х гг. фальклор Вялікай Айчыннай вайны падаецца ў кантэксце савецкага мастацтва як эпахальная з'ява, факт найвялікшай мастацкай і гістарычнай значнасці. Фалькларысты, як і ўсе ідэалагічныя работнікі, пастаўлены «на перадавую лінію агню» і абавязаны выконваць свой доўг барацьбітоў за стварэнне савецкай культуры. Менавіта ў гэты час выходзіць знакавая праца па народнай творчасці ваеннага часу – акадэмічная анталогія В. Ю. Крупянскай і С. І. Мінц «Материалы по истории песни Великой Отечественной войны» (1953), у яе ўключаны беларускія матэрыялы з архіваў ДЛМ і ІЭ. Сёння можна пагадзіцца з ацэнкай В. К. Сакаловай,

[1] Пастанова ЦК ВКП (б) «Аб оперы "Вялікая дружба» В. Мурадэлі» ад 10 лютага 1948 г. Тлумачэнне гэтых рашэнняў Камуністычнай партыі даў А. А. Жданаў на нарадзе дзеячаў савецкай музыкі ў ЦК ВКП (б) (студзень 1948 г.).

дадзенай яшчэ ў 1975 г., што па паўнаце і дакладнасці каментарыяў праца В. Ю. Крупянскай і С. І. Мінц з'яўляецца неператузыдзеным да нашага часу ўзорам навуковага выдання песень Вялікай Айчыннай вайны.

У перыяд *з 1956 па 1960-я гг.* апублікавана і даследавана, хаця і тэндэнцыйна, частка экспедыцыйных матэрыялаў пасляваенных гадоў; фальклор Вялікай Айчыннай вайны разглядаецца як народная творчасць у яе новай гістарычнай фармацыі, элемент сацыялістычнай культуры; у тэарэтычным асэнсаванні матэрыялу па многіх пазіцыях прымяняюцца ідэалагізаваныя падыходы.

Захаваліся толькі адзінкавыя звесткі пра палявую работу па фіксацыі фальклору Вялікай Айчыннай вайны ў 1950–1960-я гг., напрыклад, экспедыцыйныя матэрыялы Л. С. Мухарынскай, якая распрацоўвала тэму партызанскай песні і яе самадзейных аўтараў[1]. Натуральна, песенныя і празаічныя жанры ваеннай тэматыкі запісваліся беларускімі навукоўцамі, аднак даводзіцца канстатаваць, што пры тым вялікім грамадска-палітычным значэнні, якое надавалася ў грамадстве Перамозе савецкага народа ў вайне, задачы мэтанакіраванага збору палявога матэрыялу азначанай тэматыкі саступілі месца тэарэтычнаму асэнсаванню ўжо наяўных фактаў з пазіцый марксізму-ленінізму. Пацвярджэннем служыць акадэмічная праца 1961 г. «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава, С. К. Майхровіча, уклад. І. В. Гутараў, М. Я. Грынблат, К. П. Кабашнікаў, І. Р. Сцяпунін, І. К. Цішчанка). Значная доля тэкстаў гэтага зборніка сёння патрабуе крытычнага асэнсавання.

І хаця пасля 1956 г. абмеркаванне праблем гуманітарнай навукі зрабілася больш свабодным, інерцыя ідэалагізаваных падыходаў і трактовак у беларускай фалькларыстыцы не спынялася[2]. Напрыклад, у працы Л. С. Мухарынскай «Белорусская народная партизанская песня» (1968) зроблены канцэптуальныя абагульненні і адкрыцці ў плане музыказнаўства. Пры гэтым аналіз семантыкі партызанскай песні падпарадкаваны задачы паказаць у песнятворчасці Беларусі ваеннага часу «сусанінскую гераічную традыцыю» [15, с. 3], што выканана спрошчанымі публіцыстычна завостранымі сродкамі. Даследчыца Т. Якіменка піша, што ў выніку рэдакцыі ў выдавецтве «Беларусь» рукапіс Л. С. Мухарынскай набыў такі моцны публіцыстычны ўхіл, які зацьміў вельмі складаную ўласна музыказнаўчую сферу [16, с. 54].

**Заключэнне.** Пачатак збірання, сістэматызацыі і захоўвання народнай творчасці ваеннага часу быў пакладзены ў 1941–1945 гг. экспедыцыямі ў вызваленыя раёны краіны. Важную ролю адыгрывала работа з карэспандэнтамі. Вядучымі цэнтрамі з'яўляліся УДНТ, ДЛМ, ІЭ (Масква), ІРЛІ (Ленінград). У Беларусі з 1944 г. найбольш сістэматычна гэта праца вялася ў АН БССР. Значны даследчы матэрыял далі экспедыцыі М. Я. Грынблата, Л. Р. Барага, М. С. Мяровіч і Л. С. Мухарынскай. У пасляваенны час задачы збірання і вывучэння фальклору Вялікай Айчыннай вайны ставіліся ва ўсіх саюзных рэспубліках і каардынаваліся дзяржаўнымі органамі. Дзейнасць фалькларыстаў трактавалася ў кантэксце марксісцка-ленінскай канцэпцыі народнай творчасці, што абумоўлівала селектыўны падыход да публікацыі і інтэрпрэтацыі ўзораў фальклору.

Пры тым, што навуковыя працы 1941–1960 гг. сёння патрабуюць новага прачытання, будзе неаб'ектыўным спрашчаць здабыткі навукі гэтага перыяду. Матэрыялы экспедыцый паказалі абсалютную ўнікальнасць такой з'явы, як фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Была даказана неаднароднасць яго стылістыкі, якая з'явілася вынікам узаемадзеяння традыцыйна-народных з'яў культуры з новымі мастацкімі сістэмамі, у тым ліку выпрацаванымі прафесійнай творчасцю. «Усё, што зроблена ў гэтым кірунку – створаныя анталогіі і зборнікі, архіўныя і музейныя зборы, – пісаў В. Я. Гусеў, – ёсць адна з форм увекавечання ўсенароднага подзвігу» [17, с. 9]. Збіральніцкая і публікатарская дзейнасць фалькларыстаў і этнографаў у 1941–1960 гг. мае вялікае грамадскае і навуковае значэнне.

[1] БДАМЛіМ. – Фонд 349. Воп. 1. С. 82. Запісы беларускіх народных песень у Мядзельскім раёне Мінскай вобласці 1950–1951 гг., л. 89.

[2] У томе БНТ «Песні савецкага часу» (1970) большасць песень раздзела Вялікай Айчыннай вайны публікаваліся раней, а зборнік «Паэзія барацьбы» (1985) зроблены на аснове матэрыялаў выдання 1961 г.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Фронтовой фольклор: Песни, пословицы, поговорки / Зап., вступ. ст. и коммент. В. Ю. Крупянской. – М. : Тип. Госэнергоиздата, 1944. – 132 с.

2. Гусев, В. Е. Славянские партизанские песни / В. Е. Гусев. – Л. : Наука, 1979. – 176 с.

3. Соймонов, А. Д. Собирание и изучение русского фольклора Великой Отечественной войны / А. Д. Соймонов // Русский фольклор Великой Отечественной войны ; Акад. наук СССР ИРЛИ (Пушкинский дом). – Л. ; М. : Наука, 1964. – С. 9–40.

4. Минц, С. И. Фольклор Великой Отечественной войны в московских архивах / С. И. Минц // Советская этнография. – 1946. – № 2. – С. 188–192.

5. Соколова, В. К. Из истории изучения фольклора Великой Отечественной войны / В. К. Соколова // Этнографическое обозрение. – 1975. – № 3. – С. 7–14.

6. Дмитриева, С. И. Материалы по фольклору Великой Отечественной войны, хранящиеся в архиве Института этнографии АН СССР / С. И. Дмитриева // Русский фольклор Великой Отечественной войны / Акад. наук СССР ИРЛИ (Пушкинский дом). – Л.; М.: Наука, 1964. – С. 409–411.

7. Крупянская, В. Ю. Материалы по истории песни Великой Отечественной войны : [тексты с комментариями] / В. Ю. Крупянская, С. И. Минц. – М. : Изд. АН СССР, 1953. – 210 с.

8. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 79. Воп. 1. С. 75. Л. 377.

9. Гершкович, Б. Совещание по вопросам собирания, изучения и издания фольклора Великой Отечественной войны / Б. Гершкович, В. Крупянская, В. Соколова // Советская этнография. – 1948. – № 2. – С. 209–216.

10. Задачи этнографов в связи с положением на музыкальном фронте // Советская этнография. – 1948. – № 2. – С. 3–7.

11. Березовський, І. П. Українська радянська фольклористика. Етапи розвитку і проблематика / І. П. Березовський. – К. : Наук. думка, 1968. – 343 с.

12. Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны / ІМЭФ АН БССР; рэдкал.: П. Ф. Глебка (гал. рэд.). – Мінск: Выд. АН БССР, 1961. – 617 с.

13. Барташэвіч, Г. А. Месца традыцыйнай песні ў беларускай народнай творчасці Вялікай Айчыннай вайны / Г. А. Барташэвіч // Тэзісы дакладаў канф. «Вынікі даследаванняў беларускай народнай творчасці», Мінск, люты 1969 г. / Акад. навук БССР; рэдкал.: М. Я. Глынблат (гал.рэд.). – Мінск : Выд. АН БССР, 1969. – С. 21–22.

14. Фядосік, А. С. Беларуская савецкая фалькларыстыка / А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 348 с.

15. Мухаринская, Л. Белорусская народная партизанская песня: 1941–1945 / Л. Мухаринская. – Минск : Беларусь, 1968. – 63 с.

16. Якименко, Т. С. Пламенность отдачи науке, педагогике, людям. Лидия Сауловна Мухаринская / Т. С. Якименко // Вес. Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2012. – № 20. – С. 47–56.

17. Гусев, В. Е. Народное творчество в годы Второй мировой войны и задачи его исследования / В. Е. Гусев // Советская этнография. – 1980. –№ 4. – С. 3–11.


## References


1. Krupyanskaya V. Y. (ed.) Front-line folklore: songs, proverbs, sayings. Moscow, Gosenergoizdat Publ., 1944. 132 p. (in Russian).

2. Gusev V. Y. Slavic Partisan Songs. Leningrad, Nauka Publ., 1979. 176 p. (in Russian).

3. Soymonov A. D. Collecting and studying Russian folklore of the Great Patriotic War. Gusev V. E. (ed.). *Russian folklore of the Great Patriotic War.* Moscow, Leningrad, Nauka Publ., 1964, pp. 9–40 (in Russian).

4. Mintz S. I. Folklore of the Great Patriotic War in Moscow archives. *Sovetskaya etnografiya* [Soviet Ethnography], 1946, no. 2, pp. 188–192 (in Russian).

5. Sokolova V. K. From the history of the study of the Great Patriotic War folklore, *Ethnograficheskoe obozreniye* [Ethnographic Review],1975, no. 3, pp. 7–14 (in Russian).

6. Dmitrieva S. I. Materials on the folklore of the Great Patriotic War stored in the archives of the Institute of Ethnography of the USSR Academy of Sciences. Gusev V. E. (ed.). *Russian folklore of the Great Patriotic War.* Moscow, Leningrad, Nauka Publ., 1964, pp. 409–411 (in Russian).

7. Krupyanskaya V. Y. Materials on the song history of the Great Patriotic War: [texts with comments]. Moscow, Publishing House of the USSR Academy of Sciences, 1953. 210 p. (in Russian).

8. Belarusian State Archive-Museum of Literature and Art. Fund 79, inventory 2, case 75, sheet 377 (in Russian).

9. Gershkovich B., Krupyanskaya V., Sokolova V. (ed.). Meeting on the collection, study and publication of the folklore of the Great Patriotic War. *Sovetskaya etnografiya* [Soviet Ethnography], 1948, no. 2, pp. 209–216 (in Russian).

10. The goals of ethnographers regarding the situation on the musical front. *Sovetskaya etnografiya* [Soviet Ethnography], 1948, no. 2, pp. 3–7 (in Russian).

11. Berezovsky I. P. Ukrainian Soviet folklore studies. Stages of development and agenda. Kiev, Naukova Dumka Publ., 1968. 343 p. (in Ukrainian).

12. Glebka P. F. (ed). Belarusian folklore of the Great Patriotic War. Minsk, Publishing House of the BSSR Academy of Sciences, 1961, 617 p. (in Belarusian).

13. Bartashevich G. A. Location traditional songs in the Belarusian Folk Art of the Great Patriotic War. *Vyniki dasledavanniau belaruskaj narodnaj tvorchasci: tezisy dakl. navuk. kanf.* Misk, liuty 1969 g. [The results of Belarusian folk art research: Abstracts of the conference. Minsk, February 1969]. Minsk,Publishing House of the BSSR Academy of Sciences, 1969, pp. 21–22 (in Belarusian).

14. Fyadosik A. S. Belarusian Soviet folklore. Minsk, Navuka i Technika Publ., 1987, 348 p. (in Belarusian).

15. Mucharinskaya L. S. Belarusian folk partisan song: 1941–1945. Minsk, Belarus Publ., 1968, 63 p. (in Russian).

16. Yakimenko T. S. Flameful returns to science, pedagogy, people. Lidiya Saulovna Muharinskaya. *Vestsi Belaruskay dzyarzhaynay akademii muzyki* [The News of the Belarus State Academyof Music], 2012, no. 20, pp. 47–56. (in Russian).

17. Gusev V. Y. Folk art during the Second World War and its research objectives. *Sovetskaya etnografiya* [Soviet Ethnography], 1980, no. 4, pp. 3–11 (in Russian).

## Иформация об авторе

**Гулак Анастасия Анатольевна** – кандидат филологических наук, доцент. Белорусский государственный университет культуры и искусств (ул. Рабкоровская, 17, 220007, Минск, Республика Беларусь). E-mail: rodolfina.hulak@tut.by

## Information about the author

**Nastassia A. Hulak** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor. Belarusian State University of Culture and Arts (17 Rabkorovskaya Str., Minsk 220007, Belarus). E-mail: rodolfina.hulak@tut.by